УДК 339.543(093)

# БЕЛАРУСЫ Ў ПАМЕЖНЫХ ВОЙСКАХ І МЫТНАЙ СЛУЖБЕ ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1921–1939 гг.)

***Юрый* Грыбоўскі**

**Уводзіны.** Пытанне службы беларусаў у польскай памежнай і мытнай службе практычна не даследаваная старонка гісторыі. Таму аўтар лічыць сваёй задачай асвятліць службу беларусаў у пагранічных і мытных фармаваннях 2-й Рэчы паспалітай, у першую чаргу Корпуса аховы пагранічча. Увесці ў навуковы абарот новыя факты аб дзейнасці асобных польскіх памежнікаў і мытнікаў беларускага паходжання.

**Асноўная частка.** У міжваенны перыяд урадам 2-й Рэчы Паспалітай надавалася значная ўвага ахове дзяржаўнай і мытнай мяжы. З мэтай вырашэння гэтай задачы ў 1924 г. быў створаны Корпус аховы памежжа (КАП). Асноўнай задачай гэтай мілітарнай адзінкі была ахова ўсходняй дзяржаўнай мяжы польскай дзяржавы. Фармаванні КАП былі добра ўзброеныя і падрыхтаваныя. Арганізацыя КАП была абаперта на брыгадах, якія ў сваю чаргу складаліся з палкоў і батальёнаў.

У 1921–1939 гг. у межах міжваеннай польскай дзяржавы знаходзілася каля 2 млн. беларусаў, якія кампактна пражывалі на Віленшчыне, Навагрудчыне, Палессі і Беласточчыне. Гэтыя людзі, як польскія грамадзяне, служылі ва ўзброеных сілах Польшчы і іншых ваенізаваных структурах. Мэтай дадзенага артыкула будзе асвятленне аднаго з малавядомых эпізодаў у гістарыяграфіі, якім з'яўляецца ўдзел польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці ў памежных войсках і мытнай службе 2-й Рэчы Паспалітай. Да сярэдзіны 1920-х гг. польска-савецкая мяжа была шматразова парушана з абодвух бакоў. Даходзіла да шматлікіх інцыдэнтаў і канфліктаў. У сувязі з гэтым мяжа патрабавала ўзмацнення яе аховы. З мэтай вырашэння гэтай задачы ў 1924 г. быў створаны Корпус аховы памежжа (КАП). Асноўнай задачай гэтай мілітарнай адзінкі была ахова ўсходняй дзяржаўнай мяжы польскай дзяржавы. На захадзе і поўдні межы вартавала памежная служба. КАП дзейнічаў у структурах Міністэрства ўнутрах спраў (МУС), а не Міністэрства вайсковых спраў (МВС). Фармаванні КАП былі добра ўзброеныя і ў сэнсе вайсковай падрыхтоўкі і дысцыпліны нічым не адрозніваліся ад аддзелаў Войска Польскага. На выпадак вайны аддзелы КАП падпарадкоўваліся МВС і падлягалі мабілізацыі на роўні з фармаваннямі Войска Польскага. Арганізацыя КАП была абаперта на брыгадах, якія ў сваю чаргу складаліся з палкоў і батальёнаў. На паўночна-усходніх тэрыторыях даваеннай польскай дзяржавы кватаравалі наступныя брыгады корпусу: «Гродна», «Навагрудак», «Вільня», «Палессе». У сярэдзіне 1930-х гадоў адбылася пэўная рэарганізацыя корпусу, у выніку чаго асноўнай тактычнай адзінкай КАП сталі палкі. На тэрыторыі паўночна-усходніх ваяводстваў знаходзіліся наступныя палкі: «Валожын», «Баранавічы», «Вільня», «Глыбокае». Апрача таго, былі захаваныя дзьве брыгады – «Гродна» і «Палессе» [1]. У сувязі з тым, што КАП мусіў выконваць вельмі складаныя палітычныя і вайсковыя заданні, гэтаму фармаванню прысвечана значная ўвага. Дбаючы пра лаяльнасць і надзейнасць асабовага



Zbornik.indd 107 14.12.2010 23:44:11

складу камандаванне намагалася абмежаваць колькасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей сярод вайскоўцаў корпусу. З сумеснай інструкцыі міністра вайсковых спраў і міністра ўнутраных спраў ад 14 кастрычніка 1924 г. вынікала, што ўсе кандадаты павінны быць польскай нацыянальнасці. 28 жніўня 1926 г. камандуючы КАП выдаў распараджэнне, у якім адзначалася, што лічба «нацменаў» сярод асабовага складу корпусу не павінна перавышаць 10% [2, s. 41, 103].

У наступныя гады быў выдадзены шэраг іншых інструкцый у справе тыпавання кандадатаў да КАП, і ўсе яны ўтрымлівалі інфармацыю наконт абмежаванняў. Разам з тым, у гэты час вайсковыя ўлады не забаранялі поўнага прыйма непалякаў у шэрагі фармаванняў КАП. Як вынікала з распараджэння ІІ віцэ-міністра ўнутраных спраў генерала Казімера Фабрыцкага, якое датычылася прынцыпаў фармавання новых пяці пяхотных батальёнаў КАП, «пры вызначэнні шэрагоўцаў сярод прызыўнікоў дзеля службы ў КАП нацыянальнасцю карыстацца не абавязкова. Належаць аднак намагацца, каб трапіла як мага найменш русінаў і беларусаў» [3, s. 120–121].

Гэткае стаўленне вайсковых уладаў у значнай ступені тлумачылася палітычнай непэўнасцю прызыўнікоў-непалякаў. Сведчыць пра гэта ліст камандзіра КАП генерала Г. Меневіча да ІІ віцэ-міністра ўнутраных спраў ад 14 красавіка 1928 гг., у якім чытаем: «дакладваю, што праектаванае Панам генералам зніжэнне палякаў у КАП да 70% у часе закліку зробіць надта адмоўны ўплыў на стан памежнай службы, а таксама на баявую вартасць аддзелаў КАП у момант абароны. Я не здольны больш размяркоўваць 30% нацыянальных меншасцяў у гаспадарчых падраздзелах, а ужыванне іх у памежнай лінейнай службе з'яўляецца небяспечным па прычыне частых выпадкаў нелаяльнасці да дзяржавы і схільнасці да падрыўной агітацыі і дэзертырства». У якасці прыкладу ненадзейнасці прызыўнікоў-непалякаў, а перадусім беларусаў, якія служылі ў КАП, генерал Меневіч высоўваў статыстыку адносна дэзертырства. У сярэдзіне 1920-х гадоў лічба выпадкаў дэзертырства з боку вайскоўцаў праваслаўнага веравызнання складала 3,1%. Дзеля параўнання: сярод каталікоў адсотак дэзертырства складаў толькі 0,5% [3, s. 120–121]. Акрамя таго, у пратаколе інспектавання КАП ад 11 мая 1928 г. гаварылася: «служба ў КАП патрабуе ад жаўнера акрамя высокіх фізічных, яшчэ і маральных валяраў… Шэраговец КАП вельмі часта мусіць прымаць самастойнае рашэнне, а перадусім быць упартым да камуністычнай агітацыі... Мусіць мець высока развітае дзяржаўнае пачуццё... як агульнавядома, нашыя нацыянальныя меншасці не адпавядаюць гэтым патрабаванням» [4, s. 179].

Па вышэйзгаданай прычыне вайсковыя ўлады акрэслівалі колькасныя межы прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў у фармаваннях КАП. Да сярэдзіны 30-х гадоў дапушчалася не больш 20% непалякаў сярод шэрагоўцаў рэзэрвы. Аднак у адпаведнасці з лістам камандзіра КАП генерала Яна Крушэўскага да шэфа дэпартаменту камплектавання МВС генерала Фларыяна Смыкаля ад 12 жніўня 1936 г. у справе набору ў КАП прызыўнікоў 1915 г. н. ўтрымлівалася прапанова аб неабходнасці паменшыць лічбу непалякаў да 15%. Належала, каб у кожным батальёне КАП русіны, беларусы і ўкраінцы складалі не больш 2% асабовага складу [5, s. 358–359]. Прадугледжвалася аднак, што прадстаўнікі вышэйзгаданых нацыянальных груп маглі складаць 5% у кавалерыі КАП. Катэгарычна забаранялася заклікаць асоб, якія вярнуліся з СССР пасля 1922 гг., парушальнікаў савецка-польскай дзяржаўнай мяжы, а таксама грамадзянаў, якія маюць блізкіх сваякоў у СССР у трэцім і далёкіх у другім пакаленні, падазроных у кантактах з камуністычным рухам. Непалякаў прадугледжвалася накіроўваць у табаровыя і дапаможныя падраздзелы КАП, дыстанцуючы ад заангажавання ў вартаўнічай службе [5, s. 230]. Аналагічнага меркавання камандаванне КАП прытрымлівалася ў дачыненні да прызыўнікоў і 1917 г.н. Больш таго, у дачыненні да апошніх максімальная лічба беларусаў, русінаў і ўкраінцаў акрэслівалася ў сапёрных і кавалерыйскіх фармаваннях КАП — да 3%. Гэткія патрабаванні вынікалі з таго, што ў часе закліку прызыўнікоў 1916 г. н. ў кавалерыйскія часці КАП патрапіла ажно 5% беларусаў, украінцаў і русінаў, як у пяхоце прадстаўнікі гэтых этнічных груп склалі 1% [5, s. 542–543].

З мэтай забеспячэння належнай колькасці палякаў сярод часцей корпуса прадугледжвалася праводзіць наборы ў фармаванні КАП у асноўным за кошт фармаванняў Войска Польскага, якія кватараваліся ў цэнтральнай Польшчы [5, s. 274.]. У загадзе МВС ад 1 лістапада 1937 г. адзначалася, што батальён КАП «Сарны», які быў сфармаваны для аховы мяжы



Zbornik.indd 108 14.12.2010 23:44:12

на ўмацаваным фартыфікацыйным прамежку «Сарны» ў абарончай сістэме «Палессе», павінен быў цалкам складацца з палякаў, закліканых выключна з павятовай камендатуры «Люблін». Нават падчас усеагульнай мабілізацыі ў батальён КАП «Сарны» дапушчалася мабілізоўваць толькі рэзервістаў з Люблbackнш чыны. У сувязі з гэтым, камандаванне КАП настойвала на тым, каб аддзелы камплектаваліся палякамі на 80%. У выпадку, калі гэта выклікала вялікую затрату прызыўнікоў-палякаў, то з гэтым належала пагадзіцца. У вышэйзгаданым пратаколе адзначалася, што КАП патрэбна камплектаваць з ліку прызыўнікоў з 32-га, 50-га, 10-га, 26-га пяхотных палкоў [5, s. 499].

Варта аднак падкрэсліць, што як і ў выпадку з Войскам Польскім, захоўваць належныя невысокія адсоткі непалякаў у фармаваннях КАП было досыць складана. На чэрвень 1928 г. у КАП служыла 2 910 вайскоўцаў, якія не валодалі чытаннем і пісаннем польскай мовы. [5, s. 132] Як вынікае са справаздачы намесніка камандзіра КАП палкоўніка Бітнэра ад 11 студзеня 1939 г., які інспектаваў батальёны «Сноў», «Стоўпцы», «Клецк» і іх дапаможныя фармаванні, колькасць непалякаў сярод шэрагоўцаў рэзервы тут даходзіла да 40% і 20% — падафіцэраў рэзервы, як у ліку асоб польскай нацыянальнасці значную частку складалі людзі неадпаведнага веку — ад 35 да 45 гадоў [5, s. 580]. Згодна з польскімі крыніцамі ў 1938 г. у пяхоце, кавалерыі, артылерыі і сапёрных часцях КАП беларусы складалі 3% [6, s.105]. Найбольш заўважнай колькасць беларусаў была сярод рэзервістаў з паўночна-усходніх абшараў 2-й Рэчы Паспалітай. У мірны час гэтыя людзі былі прыпісаныя да часцей КАП. Гэта было звязана з тым, што 22 снежня 1938 г. камандзір КАП генерал Крушэўскі прапанаваў даручыць справу рэгулявання працэнтных суадносінаў палякаў і непалякаў непасрэднаму камандаванню палкоў і брыгадаў, якія, на думку генерала, арыентаваліся ў нацыянальным складзе мясцовасцяў пастою падначаленых ім часцей. Крушэўскі прыйшоў да высновы, што адносна невысокі лік нацыянальных меншасцяў сярод прызыўнікоў у КАП не патрабуе адпаведнай высокай лічбы палякаў у дачыненні да рэзервістаў [7, s. 574]. З гэтае прычыны многія жыхары Гродзеншчыны, Віленшчыны і Палесся на выпадак вайны былі прыдзеленыя да аддзелаў КАП, у шэрагах якіх і сустрэлі пачатак Другой сусветнай вайны.

КАП небеспадстаўна лічыўся выбаровай і элітарнай адзінкай, вайскоўцы якой рэпрэзентавалі высокі маральны і патрыятычны дух. Сведчыць пра гэта факт, што вайскоўцы КАП не былі схільнымі да вядзення антыдзяржаўнай дзейнасці. Найбольшую небяспеку для польскіх улад стварала Кампартыя Заходняй Беларусі. У кастрычніку 1932 г. кіраўніцтва КПЗБ адзначала, што план працы сярод вайскоўцаў КАП рэалізаваны толькі на 30%. Да ліку месцаў, дзе праца вайсковай арганізацыі не была наладжана ўвогуле, належалі вайсковыя гарнізоны ў Гродне, Маладэчне і Свянцянах. Больш таго, з пяці брыгадаў Корпуса аховы памежжа, якія кватараваліся ў паўночна-усходніх ваяводствах, ані ў водным не было створана вайсковых ячэйкаў партыі [8, л. 239].

Польскія грамадзяне беларускага паходжання служылі не толькі ў аддзелах КАП, але такскама ў мытнай службе 2-й Рэчы Паспалітай. У 1919-1921 гг. у складзе Войска Польскага дзейнічала Беларуская вайсковая камісія (БВК), якая мела на мэце стварэнне беларускіх вайсковых аддзелаў, якія павінны былі змагацца на баку Польшчы ў польска-савецкай вайне. У 1921 г. БВК была расфармавана, але некаторыя яе члены ў якасці кадравых афіцэраў залічаныя ў іншыя падраздзелы Войска Польскага і ваенізаваныя арганізацыі, у тым ліку мытную паліцыю. Да той апошняй былі прыняты два былыя палкоўнікі БВК – Аляксандр Чуніхін-Кавэцкі і Сцяпан Прылуцкі. Зараз варта азнаёміцца з вайсковай біяграфіяй гэтых людзей. Абодва пачыналі свой жаўнерскі шлях у расійскай імператарскай арміі.

Палкоўнік Чуніхін-Кавэцкі Аляксандр, сын Андрэя і Альжбэты нарадзіўся 10 ліпеня 1876 гг. у Беластоку. 31 жніўня 1892 г. скончыў Віленскую вайсковую школу. 31 жніўня 1893 г. паступіў у Віленскую юнкерскую вучэльню. У Расійскай арміі з 18 чэрвеня 1892 г. Кавэцкі досыць хутка здабываў афіцэрскія званні: падпаручніка (з 21 ліпеня 1894 гг.), паручніка (з 21 чэрвеня 1900 г.), ротмістра (з 6 снежня 1906 г.), палкоўніка (з 29 траўня 1916 гг.). 12 красавіка 1900 г. у Корпусе памежнай аховы. 23 кастрычніка 1915 г. — у 318-м Чарняхоўскім палку. З 7 лістапада 1915 г. камандзір батальёна, з 10 сакавіка 1917 г. — камандзір палка. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне. Быў параненны (30 сакавіка і 29 траўня 1916 гг.). Меў баявыя ўзнагароды: Ордэн Св. Уладзімера 4 ст., св. Ганны 3 ст., св. Станіслава 3 ст., св. Ганны 4 ст.,



Zbornik.indd 109 14.12.2010 23:44:12

св. Ганны 3 ст., св. Станіслава 2 ст. З 2 студзеня 1918 г. заангажаваны да працы па беларусізацыі часцей Румынскага Фронту. З 19 сакавіка 1919 г. у Чарнаморскім памежным атрадзе. 6 снежня 1920 г. уступіў у Войска Польскае ў якасці афіцэра рэзервы пры беларускіх аддзелах. У 1921 г. быў пераведзены ў мытную паліцыю і з 26 жніўня 1921 г. стаў камандзір 36-га мытнага батальёну (Лодзь) [9].

Палкоўнік Прылуцкі Сцяпан, сын Ігната, нарадзіўся 20 кастрычніка 1875 г. у Беластоку. У войску з 4 верасня 1893 г. У 1895–1897 гг. навучаўся ў Віленскай афіцэрскай школе. З 4 кастрычніка 1909 г. у Корпусе памежнай аховы (камандзір атрада). 1911–1914 гг. — у штабе 2-й памежнай акругі (старэйшы ад'ютант). 1915–1916 гг. — у штабе 10-й арміі (камандзір батальёна). Меў узнагароды: Ордэн св. Станіслава 3 і 2 ст., св. Ганны 3 і 2 ст. У Войску Польскім з 17 снежня 1919 г. у якасці добраахвотніка ў беларускіх аддзелах. З 24 лютага 1920 г. — 1-ы сябра ганаровай роты камандавання беларускіх аддзелаў. З 7 красавіка 1920 г. — намеснік камандзіра беларускіх аддзелаў. З 25 траўня 1921 г. — у аддзеле кантролю ў камандаванні генеральнай акругі «Лодзь». З 8 кастрычніка 1921 г. — камандзір 33-га мытнага батальёна [10].

Падчас службы ў структуры мытнае службы Чуніхін-Кавэцкі і Прылуцкі зарэкамендавалі сябе з лепшага боку. Як сведчанне гэтага можна прывесці ўрывак з рапарта галоўнага каменданта мытнага батальёна ад 11 траўня 1922 гг., у якім адзначалася, што Кавэцкі: «Паказаў сябе на гэтай пасадзе як надта добры афіцэр, дбаючы пра дабро свайго аддзелу, як у маральным сэнсе, гэтак і матэрыяльным. Праведзеная ў ягоным батальёне інспекцыя дала добрыя вынікі, засведчыла ягоную руплівасць, моцную волю, энэргію і веданне сваіх абавязкаў» [11]. На жаль, у сярэдзіне 1920-х гг. след абодвух губляецца. Вельмі праўдападобна, што яны былі звольненыя са службы ў сувязі з пенсійным узростам.

Апошнім эпізодам удзелу беларусаў у памежнай і мытнай ахове даваеннай польскай дзяржавы быў іх удзел у кампаніі 1939 г. Ува ўсходніх ваяводствах мабілізацыяй апрача вайсковых павятовых камендатураў займаліся структуры КАП. Прадугледжвалася павелічэнне шэраговага складу кожнага батальёна КАП за кошт рэзервістаў з 200 да 700 чал. На 1 чэрвеня 1939 г. былі ўкамплектаваныя па стану ваеннага часу і накіраваны ў заходнія і цэнтральныя ваяводствы Польшчы 20 батальёнаў корпусу, большасць з якіх былі ўключаны ў склад Арміяў «Кракаў» і «Лодзь». Палкі КАП «Гародня» і «Вільня» ўкамплектавалі 33-ю рэзервовую пяхотную дывізію, за кошт брыгады «Палессе» і палка «Баранавічы» паўстала 38-я рэзервовая пяхотная дывізія, палкі «Глыбокае», «Валожын» і «Вілейка» былі мабілізаваныя ў 2-гі і 3-ці пяхотныя палкі КАП [12]. Агулам КАП перадаў у дзеючую армію 39 пяхотных батальёнаў. Цяжка меркаваць пра нацыянальны склад аддзелаў КАП. Аднак, несумніўна, ён быў досыць стракаты. Згодна з планам камандзіра КАП генерала Я. Крушынскага, які быў прапанаваны ў траўні 1939 г., меркавалася на камплектаванне фармаванняў корпуса накіраваць значную колькасць прызыўнікоў з заходніх рэгіёнаў краіны. Аднак, як падаюць польскія крыніцы ў некаторых фармаваннях, якія былі створаныя на зломе жніўня — верасня 1939 г. на месцах адбыўшых на Захад аддзелаў КАП, нацыянальныя меншасці складалі заўважны адсотак. У прыватнасці, як узгадвалі польскія афіцэры, у батальёне «Людвікава» непалякі налічвалі 30% [13, s. 161]. Вайскоўцы КАП і функцыянеры мытнай паліцыі ў верасні 1939 г. мужна змагаліся на франтах, абараняючы як заходнія, так і ўсходнія межы сваёй айчыны. Многія з іх загінулі, прадэманстраваўшы прыклады гераізму і самаахвярнасці на полі бою. Польскія вайскоўцы ўсіх нацыянальнасцей, сярод іх і беларусы, выканалі свой жаўнерскі і грамадзянскі абавязак [14].

**Заключэнне.** Можна канстатаваць, што доля беларусаў, служыўшых у памежных і мытных органах у даваеннай Польшчы была нязначнай. Яны належным чынам выконвалі свой вайсковы абавязак і загады свайго камандавання. У складзе Корпуса аховы памежжа разам з украінцамі і русінамі колькасць беларусаў дасягала 3%. Служылі беларусы і ў польскай мытне. Вядомы два камандзіры мытных батальёнаў – былыя палкоўнікі Беларускай вайсковай камісіі – Аляксандр Чуніхін-Кавэцкі і Сцяпан Прылуцкі.



Zbornik.indd 110 14.12.2010 23:44:12

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Prochowicz, J. Formacje Korpusu Ochrony Pogranicza w 1939 roku. Warszawa, 2003; J. Prochwicz, A. Konstankiewicz, J. Rutkiewicz. Korpus Ochrony Pogranicza 1924–1939. Warszawa, 2003.
2. O niepodległą i granice. Korpus Ochrony Pogranicza 1924–1939. Wybór dokumentów. Warszawa-Pułtusk, 2001.
3. O niepodległą i granice. Korpus Ochrony Pogranicza 1924–1939. Wybór dokumentów. Warszawa-Pułtusk, 2001.
4. Waszkiewicz, Z. Duszpasterstwo w siłach zbrojnych Drugiej Rzeczypospolitej (1918–1939). S. 107; Kęsik J. Naród pod bronią. Społeczeństwo w programie polskiej polityki wojskowej. 1918–1939.
5. O niepodległą i granice. Korpus Ochrony Pogranicza 1924–1939.
6. Waszkiewicz Z. Duszpasterstwo w siłach zbrojnych Drugiej Rzeczypospolitej (1918–1939).
7. O niepodległą i granice. Korpus Ochrony Pogranicza 1924–1939.
8. Дзяржаўны архіў гродзенскай вобласці (ДАГВ), ф. 122, воп. 1, спр. 1.
9. Centralne Archiwum Wojskowe (CAW), sygn.: AP 2402.
10. CAW, sygn.: AP 10895.
11. CAW, sygn.: AP 2402.
12. Dominiczak H. Ochrona granicy wschodniej w latach 1919–1939. Warszawa, 1985.
13. Prochowicz J. Formacje Korpusu Ochrony Pogranicza w 1939 roku, Warszawa, 2003. S. 161.
14. Grzybowski J. Białorusini w polskich regularnych formacjach wojskowych w latach 1918–1945. Warszawa 2007.

## Аннотация

**Грибовский Ю. Белорусы в составе пограничных войск и таможенной службе Польши в 1921–1939 гг. (статья). – Минск, 2009.**

В статье освещается служба представителей белорусской национальности в составе пограничной и таможенной служб довоенной Польши (1921–1939 гг.).

## Annotation

***Yury* Grybovski. Belarusians as a part of frontier troops and customs service of Poland in 1921–1939 (article). – Minsk, 2009.**

In article questions of service of representatives of the Belarus nationality as a part of boundary and customs services of prewar Poland (1921–1939) are considered.

**УДК 339.543(094)**

# ТАМОЖЕННОЕ ПРАВО ЕВРОПЕЙСКОГО СОЮЗА. ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ТАМОЖЕННО-ПРАВОВЫХ СИСТЕМ ЕС И РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

***Виктор* Острога,**
***Елена* Поликовская**

**Введение.** Понятия «таможенное право Европейского Союза», «таможенное право Европейского Сообщества», или «европейское таможенное право», получили широкое распространение в зарубежной и отечественной юридической литературе. Однако четкого научного обоснованиия этих понятия, на наш взгляд, до сих пор не дано. Очевидно, что оно может быть обосновано через инструментарий дисциплин «Общее европейское право» (или «Право ЕС») и «Таможенное право». В рамках данного подхода и необходимо рассматривать особенности правового регулирования таможенных отношений в рамках не только Европейского Союза, но и других региональных интеграционных объединений.

В настоящей статье ставятся следующие задачи:

– раскрыть содержание таких понятий, как «европейское право», или «право Европейских сообществ», «таможенное право ЕС»;

– проанализировать проблему имплементации правового опыта ЕС в таможенной сфере Республикой Беларусь и ЕврАзЭС;

– определить основные направления и перспективы сотрудничества ЕС и Беларуси в сфере таможенного права.

**Основная часть.** Что понимать под термином «европейское право» – в юридической науке нет единого мнения. Этим термином может обозначаться и совокупность национальных правовых норм (правовых систем) государств-членов ЕС, и блок межгосударственных правовых норм, действующих в «Единой Европе». Наиболее точным определением понятия «европейское право» можно считать «совокупность правовых норм, регулирующих взаимоотношения, складывающиеся в рамках европейских интеграционных объединений, в рамках Европейских сообществ и Европейского Союза»[1, с. 60]. Европейское право в этом смысле представляет собой особую самостоятельную правовую систему, существующую наряду с национальным правом государств-членов европейских интеграционных объединений и международным правом. Такой подход был закреплен, в частности, Судом Европейских сообществ. Согласно концепции, сформулированной в его решениях, «Сообщество образует новый международно-правовой порядок, в пользу которого государства ограничили, хотя и в лимитированных областях, свои суверенные права и субъектами которого являются не только государства-члены, но и выходцы из этих государств». И далее: «В отличие от обычных международных договоров, Договор об учреждении ЕЭС создал особый правовой порядок, интегрированный в систему права государств-членов с момента его вступления в силу и имеющий обязательную силу для их судебных органов» [1, с. 82].

Таким образом, понятие «европейское право» отражает концепцию, согласно которой этим понятием обозначается система правовых норм, созданных в связи с образованием и функционированием Европейских сообществ



Zbornik.indd 112 14.12.2010 23:44:12